# УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЕСНІК

№ 2 (198)
ЛЮТЫ
2014

Выдаецца з мая 1996 г. Перыядычнасць - 1 раз у месяц

Газета Установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»




## С Днем защитников Отечества!

***Ректорат от души поздравляет мужчин университета с Днем защитников Отечества и Вооруженных Сил Республики Беларусь, праздником, который воплотил в себе мужество, героическое прошлое нашего народа.***

***Желаем мирного неба над головой, крепкого, по-настоящему мужского здоровья и энергии, целеустремленности, несгибаемой воли в достижении поставленных целей, благополучия. Успехов Вам в трудовой деятельности на благо процветающей родной Беларуси.***



## Дорогие женщины!



***Ректорат университета сердечно поздравляет Вас с первым весенним праздником – Днем 8 Марта.***

***Желаем Вам крепкого здоровья, больших творческих сил, оптимизма, семейного благополучия, весеннего настроения.***

***Пусть каждый день жизни дарит Вам радость, тепло, счастье. Пусть в Вашем доме царит уют, покой и доброта!***

## Высокая награда

***За многолетнюю плодотворную работу, образцовое выполнение служебных обязанностей и высокое профессиональное мастерство, значительный личный вклад в развитие системы образования Президент Республики Беларусь Александр Григорьевич Лукашенко удостоил государственных наград заслуженных людей страны. В числе награжденных – работники нашего университета.***



**Орденом Франциска Скорины** награжден **ВИШНЕВСКИЙ Михаил Иванович**, доктор философских наук, профессор.



**Медалью Франциска Скорины** награжден **СТАРОВОЙТОВ Леонид Евгеньевич**, декан физико-математического факультета.



**Медали «За трудовые заслуги»** удостоен **МАРЗАЛЮК Игорь Александрович**, заведующий кафедрой археологии и специальных исторических дисциплин.



**РОГОВЦОВУ Василию Ивановичу**, доктору филологических наук, профессору, присвоено почетное звание **«Заслуженный работник образования Республики Беларусь»**.

**Получение государственных наград – это знаковое событие не только для награжденных, но и для трудового коллектива в целом.**

## Изберем достойных

ВЫБОРЫ-2014



***23 марта 2014 г. в нашей стране пройдут выборы в местные Советы депутатов двадцать седьмого созыва, по результатам которых будет сформировано 178 местных Советов депутатов, в том числе 21 районный, 2 городских, 155 сельских Советов депутатов.***

Выборы депутатов в местные Советы являются свободными и проводятся на основе всеобщего, равного и прямого избирательного права путем тайного голосования. В Республике Беларусь установлены три территориальных уровня Советов: первичный, базовый и областной. К первичному территориальному уровню относятся сельские, поселковые и городские (города районного подчинения), к базовому – городские (города областного подчинения) и районные, к областному – областные Советы. Особенностью местных Советов депутатов является то, что они в своей деятельности исходят в первую очередь из интересов граждан, проживающих на соответствующей территории, решая вопросы эффективного управления на местах. Поэтому Советы депутатов в Республике Беларусь подотчетны гражданам, проживающим на соответствующей территории, и ответственны перед ними.

Предстоящие выборы – это своего рода демонстрация политической активности населения и его социального единства. Избрание достойных граждан в местные Советы – важный элемент совершенствования демократических принципов управления обществом, а также решения насущных проблем местного значения. Они также содействуют формированию института политиков и управленцев. Приобретая навыки политической деятельности на местном уровне, наиболее активные депутаты могут пополнить ряды депутатского корпуса Национального собрания Республики Беларусь.

Основными управленческими формами деятельности Советов являются сессии. На сессиях рассматриваются вопросы формирования бюджета и прогнозных показателей социально-экономического развития региона; управления государственным имуществом, находящимся в коммунальной собственности; налогов и сборов, зачисляемых в местный бюджет; развития системы здравоохранения; вопросы государственной поддержки организаций бытовых услуг, потребительской кооперации и другие, имеющие жизненно важное значение для местного населения.

Выборы во все местные Советы депутатов проводятся одновременно. Депутатом местного Совета депутатов может быть избран гражданин Республики Беларусь, достигший 18 лет, не имеющий судимости, проживающий на территории соответствующей административной единицы или связанный с ней в силу своей профессиональной деятельности.

Особенностью нынешней избирательной кампании является то, что выборы депутатов в местные Советы проходят по новым правилам: впервые применены на практике обновленные статьи избирательного законодательства. В частности, отсутствует порог явки избирателей. Данное нововведение коснется только местных выборов и не затрагивает парламентские и президентские.

Избранным считается кандидат в депутаты, получивший наибольшее число голосов избирателей, принявших участие в голосовании. Если по избирательному округу выборы признаны недействительными, а также в случае выбытия всех кандидатов в депутаты в избирательном округе проводятся повторные выборы.

Участие в выборах – это не только конституционное право каждого гражданина, а и показатель его политической зрелости и гражданской ответственности. Приходя на избирательные участки и отдавая свой голос за конкретного кандидата, мы передаем ему ряд политических полномочий представлять наши интересы в распорядительной и исполнительной системах управления. Через свою электоральную активность мы демонстрируем уровень своей политической культуры и социальной активности. И если старшее и среднее поколения населения нашего региона демонстрируют, как правило, высокий уровень избирательной активности, то некоторые молодые люди не всегда понимают значимость своего участия в формировании местных органов управления. От организованности и сплоченности избирателей во многом зависит наше будущее благополучие и авторитет страны на международной арене.

Итоги социологического исследования, проведенного УКП «Могилевский институт региональных социально-политических исследований», позволяют спрогнозировать электоральное поведение жителей Могилевщины. На вопрос анкеты: «Будете ли Вы участвовать в предстоящих выборах в местные Советы депутатов в марте 2014 года?» свою готовность прийти на избирательные участки продемонстрировали более 60%, а с учётом присоединения к ним части колеблющихся этот процент будет гораздо выше.


**С.Н.ЛИХАЧЁВА,**
**зав. кафедрой политологии и социологии.**


## Стипендии Президента молодым ученым



***Глава государства А. Лукашенко 21 января подписал распоряжение «О назначении стипендий Президента Республики Беларусь» талантливым молодым ученым на 2014 год».***

Ежемесячные стипендии Президента РБ назначены 90 талантливым молодым ученым, в том числе 10 докторам наук в возрасте до 45 лет, 47 кандидатам наук в возрасте до 35 лет, 33 молодым ученым без степени в возрасте до 30 лет.

Подписание данного распоряжения – свидетельство постоянной поддержки талантливых молодых ученых государством.

Стипендию Президента РБ получила **Маковская Наталья Владимировна**, доктор экономических наук, заведующая кафедрой экономики и управления МГУ имени А.А. Кулешова за разработку теории внутреннего рынка труда трансформационной экономики, выявление функциональных закономерностей и принципов регулирования внутренних рынков труда государственных органов управления и промышленных предприятий. Полученные результаты опубликованы в 2-х монографиях ведущих отечественных и зарубежных научных изданий, их практическая значимость подтверждена 3 актами о внедрении в деятельность комитета по труду, занятости и социальной защите Могилевского облисполкома, управления экономики Могилевского горисполкома, учебный процесс учреждения образования «Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова».


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Сёлета грамадскасць адзначае 100-гадовы юбілей Аркадзя Куляшова, які нарадзіўся 6 лютага 1914 года ў Саматэвічах Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.**

# "А Я РУКУ ГАРАЧУЮ ПРАЦЯГВАЮ ПРЫРОДЗЕ З ДВАЦЦАТАГА Ў ТРЫЦЦАТАЕ СТАГОДДЗЕ…"



Юбілейныя даты выдатных дзеячаў культуры станавіліся заўсёды знакавымі ў гісторыі развіцця грамадства. Быў час, калі такім з'явам надавалася нават пэўнае сімвалічнае значэнне – праверка жыццястойкасці кожнай нацыі. З цягам часу, вядома, прыярытэты мяняліся, але валоданне адметным індывідуумам вяршыннымі ўзорамі айчыннай паэзіі вызначала і ўзровень інтэлектуальнага стану пэўнай супольнасці. Што назіраецца ў нас сёння, наколькі нашы грамадзяне ведаюць сваіх класікаў, па творах якіх і нас успрымаюць у свеце?

На жаль, сёння мы не можам пахваліцца, што ў гэтым плане ў нас усё як у людзей. Таму зрэдку трэба напамінаць нашым суродзічам пра тых, кім мы па праву павінны ганарыцца. Вось сёлета юбілейны год Аркадзя Куляшова, народнага паэта БССР, так тады гэтае ганаровае званне іменавалася.

Аркадзь Куляшоў уваходзіць у маладзейшае пакаленне творцаў абноўленага мастацкага слова, што ішло ў літаратуру ў ІІ палове дваццатых гадоў мінулага стагоддзя. Уваходзілі творцы імкліва з вялікай верай, што новы час дакляруе сапраўднае нацыянальнае Адраджэнне, ідэя якога так пакутліва выкрышталізоўвалася на пачатку стагоддзя. Як і многія пачаткоўцы, Аркадзь Куляшоў дэбютаваў у клімавіцкай газеце "Наш працаўнік", тады Калінінскай акругі, даволі прымітыўным вершыкам "Ты мой брат", у якім дванаццацігадовы хлапчук з апломбам заяўляе ад імя пакалення змагароў: "Я помню, як мы з родных межаў турылі ворагаў палкі. Ад Магілёва й Белавежы блішчалі вострыя штыкі". Што ўсё пішацца з чужога голасу, на патрэбу часу – відавочна. Ды і выбар твора рэдакцыяй быў адпаведны таму часу "змычкі горада з вёскай". А ў пачынаючага паэта, відаць, былі і іншыя вершы, бо ўжо ў наступным годзе на старонках перыядычных выданняў друкуюцца выразна лірычныя творы, няхай яшчэ і празмерна шматслоўныя і па-маладнякоўску "квяцістыя". У трынаццаці-чатырнаццацігадовым узросце ён напісаў праніклівыя лірычныя вершы, якія склалі аснову яго першага зборніка "Росквіт зямлі" (1930 г.). Але Куляшова нельга ўспрымаць у адрыве ад таго часу. Менавіта тады раптам было аб'яўлена, што ўся паэзія павінна раўняцца на творчасць Маякоўскага, што многімі было ўспрынята літаральна: перыёдыку запаланіла лесвічная паэзія. Да гонару Куляшова, хоць тым павевам ён таксама аддаў даніну, не стаў капіраваць формы верша рускага паэта, але адважыўся на эксперыменты, якія на пачатку не далі плёну, але пазней выявіліся ў фарміраванні яго эстэтычнай пазіцыі ўжо ў канцы трыццатых гадоў, калі ім былі напісаны праграмныя вершы "Плыла, цалавалася хмарка з зямлёй…", "Магілёўская хмарка" і ў выніку – "Мая Бесядзь". Малады яшчэ зусім паэт здолеў сфармуляваць сваю эстэтычную пазіцыю, акрэсліць вартасць паэзіі як эстэтычнай з'явы. Фарміраванне асобы паэта, па сутнасці, закончылася, што сабой пацвердзіла яго паэзія часу вайны. Яго творы таго часу гучалі набатна, па сваім пафасе не ўступалі ваяўнічаму вершу Янкі Купалы "Беларускім партызанам", хоць сёння яны ўспрымаюцца неадназначна, а іншыя і ўвогуле застаюцца толькі сведкамі трагічнага часу. Усё ж балады "Маці", "Ліст з палону", "Быль аб цымбалах і цымбалісце", "Алёнка" застаюцца сярод высокай літаратуры, уражваюць глыбінёй пачуцця і майстэрскай формай яго выяўлення.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, самы супярэчлівы перыяд у нашым літаратурным працэсе, Аркадзь Куляшоў побач з многімі вершамі на злабадзённасць дня напісаў творы з адкрытымі рысамі вечнасці, што прадвяшчалі касмічную тэматыку ў літаратуры. У




1947 годзе напісаў баладу "Зямля", у якой выявіў адчуванні касманаўта (тады называў іх астраномамі), пасля звароту з міжпланетнага палёту:

*Будзе прыемнай назад вам дарога –*
*Быццам салдатам з паходу цяжкога.*

*Здасца зямля вам,*
*ад смагі зялёным,*
*Флягай з вадою, балонам з азонам.*
*Здасца яна вам, шчаслівым*
*бясконца,*
*Хлебам ружовым,*
*што выпекла сонца.*

Гэтая праніклівасць надта здзівіла касманаўта Клімука, калі ён даведаўся, што верш быў напісаны за паўтара дзесяцігоддзя да першага касмічнага палёту.

У гэты ж час Аркадзь Куляшоў натхнёна працаваў над перакладам рамана А. Пушкіна "Яўгеній Анегін", выдадзенага ў 1949 годзе да 150-гадовага юбілею рускага паэта, што стала значнай падзеяй у літаратурным жыцці Беларусі і ў творчым лёсе самога перакладчыка, паколькі стала важным фактарам у шліфоўцы ўласнага паэтычнага майстэрства.

У пачатку пяцідзясятых гадоў у творчасці А. Куляшова заўважаецца пэўны спад: ён амаль не піша вершаў, працуе над удасканаленнем вершаванай аповесці "Граніца", якая ў закончаным варыянце была выдадзена пад назвай "Грозная пушча". Потым аддаў шмат гадоў працы на кінастудыі "Беларусьфільм", дзе спачатку быў начальнікам сцэнарнага аддзела, а потым галоўным рэдактарам, напісаў сцэнарыі фільмаў "Чырвонае лісце" (у сааўтарстве з А. Кучарам), "Запомнім гэты дзень" і "Першыя выпрабаванні" (у сааўтарстве з М. Лужаніным), апошні выклікаў шмат нараканняў за адступленне ад кананічнага тэксту трылогіі Якуба Коласа "На ростанях". Але там хутчэй адчувалася рука Лужаніна.

У канцы пяцідзясятых гадоў А. Куляшоў надрукаваў некалькі вершаў, якія можна лічыць яго адказам на заявы некаторых творцаў, што А. Куляшоў як паэт скончыўся, поўнасцю выпісаўся. Ён заявіў, што не збіраецца пакідаць ганаровай пасады паэта, працуе не дзеля славы і грошай:

*Я не супраць пашаны,*
*працую, рабоце адданы,*
*На пасадзе цяжкой,*
*і не трэба мне большай пашаны.*

І ўславіў вечны пошук, нястрымныя парыванні, жаданне адкрыццяў новага, непазнанага, а знікненне з людскіх вачэй сведчыла хутчэй не пра разладжанасць са светам, а прагу спасціжэння новага. Вяртанне чалавека юбілейнага ўзросту з працяглага маўчання многія ўспрынялі скептычна:

*Перад ім,*
*як вярнуўся,*
*Не твары мільгалі, а спіны,*
*Адварочваўся кожны,*
*Хто ведаў яго, хто не знаў.*
*Ён жа,*
*ловячы смешкі*
*І чуючы крыўдныя кпіны,*
*Не зважаў на тых жаб*
*І, як бусел, іх моўчкі глытаў.*

Няўдзячная справа атаясамліваць паэта з тымі вялікімі вобразамі, што ўвасабляюць паэтычнае бачанне свету. Ды ўсё ж … Адказ скептыкам быў дадзены, бо вершы гэтага часу, склаўшыя крыху пазней кнігу паэзіі пад сімптаматычнай назвай "Новая кніга", сапраўды прадставілі Куляшова зусім у іншай іпастасі – паэта не мясцовага, а агульнаеўрапейскага маштабу. Паэт выходзіў за межы агульнапрынятага, тым часам, застаючыся цалкам ў межах беларускай літаратурнай традыцыі. У яго з'явілася багдановічаўская канцэнтрацыя думкі разам з купалаўскай метафарычнай размашыстасцю, што, урэшце, і дало ўзоры непаўторнай, толькі ўласна куляшоўскай паэзіі. Засталіся тыя самыя прыярытэты, тыя ж карціны жыцця, праблемы і жыццёвыя канфлікты, але яны падаваліся ўжо ў іншым святле, недзе акцэнтуючыся на вечнасці.

Актуальнай засталася для Аркадзя Куляшова праблема паэта і паэзіі, сваё бачанне ролі паэта ў грамадстве, сфармуляванае ім на мяжы 30-х – 40-х гадоў. Зараз яна паглыбляецца філасофскім асэнсаваннем важкасці мастацкага слова, яго ўздзеяння на чытача, у той час яшчэ вернага друкаванай кнізе. Паэт спрабуе пераасэнсаваць бяздумна напісанае раней, вымушанае альбо памылкова ўспрынятае на веру.

*Палю я рэшту дзён мізэрных,*
*Але не за цяжкія іх*
*Шуканні вечнасці ў няверных,*
*Святой любові ў несвятых.*

*І не за тое іх палю я,*
*Што абпаліўся жорстка сам,*
*Што больш за марай не палюю,*
*Гадоў на марнасць не аддам –*

*Палю з рашучасцю суровай,*
*Каб сталь з іх выплавіць да дня,*
*Загартаванаю падковай*
*Надзейна падкаваць каня.*

*Палае горан мой у соснах,*
*Куецца ў ім дарожны дух*
*Для горных круч,*
*для хваль высозных,*
*Для самых грозных завірух.*

Радкі як подступ да вырашэння яго галоўнай праблемы вартасці ўласнай паэзіі ў вірлівым гэтым веку. Часам можна сустрэць песімізм, але большасцю пераважае менавіта стваральнае, што кампануе ў сабе неўміручасць свету і індывідуума ў ім. Заглянем у яго вершы "Элегія", "Да паэзіі", "На паўмільярдным кіламетры…" і іншыя. Паэт шмат у чым удакладніў само разуменне паэтычнай творчасці, хоць, вядома, усё ўмоўна: узятае ў паэтычнай творчасці з народных капілак, яго сынам павінна быць вернута стокроць. Таму Куляшоў і паэтычна сцвярджае, што творчасць павінна садзейнічаць самаўдасканаленню чалавека. Усё яскрава праяўляецца ў многіх яго вершах, бо галоўным усё-такі становіцца вобраз звычайнага чалавека, але ў складаным узаемапераплёценні самых высокіх драматычных перажыванняў, выражаных праз асабістае. Так уласна праблемна-творчыя развагі пераходзяць увогуле ў інтымную сферу, бо ўсё ўзаемазвязана. Каханне, вера, вернасць пераплятаюцца ўвогуле з самімі паняццямі творчасці і чалавечай годнасці. І ўжо паэт пачынае мысліць глабальна, бо простае існаванне індывідуума выяўляецца на фоне не зямных, а ўжо касмічных прастораў. Паэту хочацца верыць у разумнасць дзеяння чалавека, у яго стваральную, а не разбуральную сутнасць. Таму ў інтымна-філасофскай лірыцы яго больш клопату пра магчымасць суіснавання людзей у супярэчлівым часе. Натуральна, небяспека яму бачылася толькі ў тым варожым свеце, што ўсё-такі зрэдку праяўлялася ў яго паэзіі, калі гаворка заходзіла пра лёс Планеты:

*Сачу, каб не скрануў яе з арбіты*
*Заакіянскі ядавіты грыб.*

Але можна прачытаць у яго зварот і да сваіх з такой жа перасцярогай, хоць там адрасат канкрэтна не ўказаны. Хутчэй за ўсё словы паэта трэба ўспрымаць як папярэджанне абодвум бакам процістаяння, што выявілася ў яго хрэстаматыйным вершы "Я хаце абавязаны прапіскаю…":

*Свет, не дазволю я, каб дым і пыл*
*Зямлю ператварыў*
*у бамбасховішча,*
*Мільярд прапісак –*
*у маўклівы прысак,*
*Мільярд калысак – у мільярд магіл.*

Магчымасці самазнішчэння А. Куляшоў паэтычна пераканальна паказаў у невялікай філасофскай паэме "Цунамі", у якой па-свойму засяродзіў увагу на немагчымасці сучаснага чалавека адгарадзіцца ад глабальных праблем часу. Правеўшы сваіх герояў праз шматлікія выпрабаванні, у тым ліку і атамна-знішчальныя, ён усё ж сцвярджае, што асновай ўсяго жыцця з'яўляецца спрадвечны занятак Чалавека.

*А можа, гэта не яны, а іх*
*Далёкія патомкі, што ў сваіх*
*Абліччах іх абліччы паўтарылі?*
*Хто б ні былі яны, а толькі зноў*
*Яны – жыцця людскага сувязныя,*
*Дзве долькі неразлучныя, якія*
*Вякам перадаюцца ад вякоў.*

Вечнасць існавання Сусвету непарыўна звязана ў паэта з пачуццём вернасці сваім сябрам, у якіх быў свой вялікі і трагічны лёс. Нельга без глыбокага суперажывання чытаць "Маналог", прысвечаны памяці цудоўных паэтаў, падсечаных на самым узлёце, З. Астапенку і Ю. Таўбіну. Так жа шчымліва гучаць і радкі, прысвечаныя вялікаму паэту ХХ стагоддзя А. Твардоўскаму, які ў дзяржаве партыйнага таталітарызму спрабаваў знайсці чыста чалавечую справядлівасць, і ў гэтым змаганні загінуў са светлай верай у магчымасць пабудавання грамадства роўнасці. Ці адчувалі тады паэты ўтапічнасць сваіх прагнозаў адносна пабудовы камуністычнага грамадства з яго абсалютнай роўнасцю? Дапушчальна. Таму А. Твардоўскі як апошні рыцар кідаецца ў бітву з непераможнай партыйна-бюракратычнай сістэмай, адваёўваючы правы на свабоду слова. Гэта і выказаў А. Куляшоў у паэме "Варшаўскі шлях", выявіўшы вобраз паэта-ахвярніка, паэта-прадбачальніка:

*Як не прарокам,*
*кім жа быць тады?*
*Не бойся слова гучнага –*
*прарок! –*
*Прарок не бога –*
*праўды слых і зрок.*

Прарокам праўды з усімі ўласнымі зрывамі і сляпымі служэннямі культу быў і Аркадзь Куляшоў, які сапраўды меў права сказаць:

*Хацеў бы век, які ўжо на зыходзе,*
*Забраць мяне з сабой, а я руку*
*Гарачую працягваю прыродзе –*
*З дваццатага ў трыццатае*
*стагоддзе.*

Гэтым ён сапраўды сцвердзіў, што паэзія вечная.

**Яраслаў КЛІМУЦЬ.**



## "Паслаў мне лёс блакітную раку"

Пад такой назвай 7 лютага ў Касцюковіцкім раённым Цэнтры культуры адбылася літаратурна-музычная вечарына, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта, у якой прынялі ўдзел студэнты і выкладчыкі нашага ўніверсітэта.

Дэлегацыя наведала музей А. Куляшова ў сярэдняй школе аграгарадка Новыя Саматэвічы. Сярод экспанатаў – асабістыя рэчы паэта, акуляры, аловак, асадка, некалькі аўтографаў, фотаздымкі… "Мы імкнемся захаваць памяць пра Аркадзя Аляксандравіча сярод моладзі", – адзначыла дырэктар школьнага музея. – Сёння асабліва важна папулярызаваць яго творчасць, заахвочваць маладых людзей чытаць і асэнсоўваць тыя вершы, на якіх выраслі старэйшыя пакаленні".

Пра творчы лёс А. Куляшова прысутным на вечарыне распавёў кандыдат філалагічных навук Я.І. Клімуць.

З асаблівым захапленнем прысутныя праслухалі кампазіцыі на словы Аркадзя Куляшова ў выкананні студэнтак нашага ўніверсітэта, удзельніц народнага ансамбля "Ad'libitum". Знайшлося месца і для ўспамінаў аб паэце. Уладзімір Бербераў, згадваючы пра дзеда, заўважыў: "Аркадзь Аляксандравіч быў выдатным шахматыстам. Апроч літаратуры, захапляўся космасам, фізікай".

Віталь Маслоўскі ахарактарызаваў Аркадзя Куляшова найперш як выдатнага чалавека. "Пасля таго, як здарылася няшчасце з маім бацькам, – апавядае Віталь Іванавіч, – дзядзька зрабіў усё, каб дапамагчы нашай сям'і. Прычым дапамагаў, не чакаючы падзякі. Заўжды быў далікатным і спагадлівым". Родныя паэта згадалі і пра тое, як Аркадзь Куляшоў працаваў. Ствараючы нават буйную паэму, ён не карыстаўся чарнавікамі.

"Аркадзь Куляшоў – сапраўдны геній беларускага народа, – выступаючы на вечарыне, падкрэсліў Яраслаў Іванавіч Клімуць. – Ён пакінуў нам галоўны запавет: любіць і шанаваць родную мову, памятаць пра гістарычную і культурную спадчыну". У межах святкавання 100-годдзя паэта ў Касцюковіцкім раённым краязнаўчым музеі арганізавана выстава "Аркадзь Куляшоў. Ад Бесядзі да акіяна". З экспанатамі выставы пазнаёміліся і прадстаўнікі ўніверсітэта.

**П. ЛЕВАНОВІЧ.**

# Нам 20 лет

***5 февраля отметил 20-летний юбилей отдел воспитательной работы с молодежью университета. В зале не было скучающих и случайных людей. Юбиляра поздравляли единомышленники, ветераны, коллеги, студенты, выпускники, словом, друзья.***





20 лет назад 25 января 1994 года в нашем вузе был создан отдел воспитательной работы. 20-летие отдела самым тесным образом связано с именем Т.Н. Кузьминой. С первого дня создания и все 16 лет до ухода на заслуженный отдых Татьяна Николаевна была начальником. И все это время ежедневно жила заботами, радостями и проблемами вуза. Именно ей и тем, кто эти годы шел рядом, отдел воспитательной работы обязан всем, чем сегодня гордится вуз. Более пристальное внимание стало уделяться формированию и развитию системы идейно-воспитательной работы, в которой задействованы все структуры вуза. Деятельность этого сложного механизма регулируется комплексными программами, перспективными планами и др.

Понимая, что успех идейно-воспитательной работы во многом зависит от тех, кто ею занимается, отдел воспитательной работы уделяет большое внимание повышению квалификации кураторов и деятельности студенческого актива. На протяжении многих лет работает семинар кураторов; школа студенческого актива «Лидер», пользующаяся большой популярностью у студентов; функционирует Студенческий координационный совет как высший орган самоуправления университета, а на факультетах – советы студенческого самоуправления, имеющие право решать многие вопросы.

Как и 20 лет назад, сегодня в отделе воспитательной работы с молодежью всегда многолюдно. Здесь можно встретить и преподавателя, и декана, и студентов, и даже их родителей. Все приходят по делу: деятельность клубов, кружков, объединений, создание молодежных проектов, проведение акций различной направленности, спортивных соревнований, вечеров отдыха, участие в конкурсах, организация быта и отдыха в студенческих общежитиях, волонтерской деятельности и многими другими проблемами занимается отдел. В этом легко убедиться, достаточно побывать на вечерах, концертах, конкурсах «Універсітэцкая прыгажуня», «Звездный путь», «Лучший будущий учитель года», конкурс первокурсников «Давайте познакомимся» и др.



Удивительно, как изменилась жизнь в вузе. Вместе с белорусскими студентами учатся в одних аудиториях, живут вместе в общежитиях, дружат, знакомятся, участвуют в фестивалях, конкурсах, проводят совместные мероприятия иностранные студенты. Отдел воспитательной работы сотрудничает с отделом международных связей, и это сотрудничество будет развиваться. На юбилейном мероприятии никого не оставил равнодушным Хатамов Хатамбай, туркменский студент, проникновенно прочитавший стихотворение А. Кулешова «Алеся».

Немало сил для организации и проведения мероприятий университетского и республиканского масштаба, в подготовку празднования 100-летия университета отдала начальник управления идеологической и воспитательной работы Ярошевич Евгения Александровна.

Успехи в осуществлении воспитательной работы со студентами были бы невозможны, если бы не было удивительного рационального и творческого союза между отделом и заместителями деканов по идеологической и воспитательной работе, кураторами, студентами.

Менялось название, но цели и задачи отдела всегда оставались неизменными. Деятельность его направлена на обеспечение личностного, интеллектуального, культурного и профессионального роста студентов, их социального становления, на создание оптимальных условий для развития творчества, инициативы, самоуправления, формирования здорового образа жизни с учетом интересов и потребностей.

С этого года отдел возглавляет Л.В. Набокова, выпускница нашего университета, проработавшая более 15 лет в отделе воспитательной работы с молодёжью в качестве заместителя начальника.

– Работа в отделе – это часть моей жизни, она приносит мне радость. Люблю и горжусь творческими и целеустремлёнными студентами, с которыми работаю, – говорит Людмила Васильевна.

**Екатерина ГОРДИЕВСКАЯ.**

# МОЛОДЕЖЬ – НАДЕЖДА И БУДУЩЕЕ

***31 января – 1 февраля 2014 года на базе Белорусской государственной сельскохозяйственной академии прошёл республиканский спортивно-художественный праздник «Молодежь – надежда и будущее Беларуси». В рамках этого праздника участники могли посетить выставку проектов и молодёжных инициатив ведущих вузов страны, проявить себя в ходе спортивных состязаний «Формула Будущего: Молодежь+Здоровье», так и в работе студенческой научно-практической конференции «Инициатива и деятельность студенчества: от управления к самоуправлению».***



Конференция была представлена четырьмя секциями: «Студенческое самоуправление, молодежные организации и объединения», «Реализация студенческих инициатив в сфере предпринимательства, поддержка творческих и бизнес-идей молодежи», «Информационная культура и безопасность», «Здоровье и красота – имидж современного студента, основа позитивного развития будущего поколения», на каждую из которых было предоставлено более двух десятков разнообразных проектов и идей студенческого актива.

Мне удалось принять участие в работе секции «Реализация студенческих инициатив в сфере предпринимательства, поддержка творческих и бизнес-идей молодежи». Участники с естественным юношеским максимализмом и запалом, но в то же время очень аргументированно и чётко представляли свои идеи. Было видно, что секция собрала действительно неравнодушную, амбициозную молодёжь, которая не только может предлагать свои идеи, но и делать всё для их успешного воплощения.

Выступающие подчёркивали важность наличия тренингов личностного роста и финансовой грамотности, острую необходимость менять модели и концепции обучения иностранному языку учеников начальной школы. Белорусский государственный университет транспорта на базе идеи SIFE представлял конкурс «Молодежь в предпринимательстве», который перерос от статуса открытого до республиканского с нацеленностью на международный статус.

Ключевым событием второго дня праздника стала встреча с Министром образования Республики Беларуси Сергеем Александровичем Маскевичем. Студентам удалось задать ряд интересующих их вопросов напрямую Министру и получить исчерпывающие ответы.

Министр отметил важность студенческого актива в жизни университета, порекомендовал студенческому совету быть более сплочённым, ёмко и чётко доносить свои идеи ректорату, который, в свою очередь, сможет и вправе, в разумных пределах, корректировать учебный процесс в интересах учащейся молодёжи, внедряя новые формы получения знаний, давая возможности студентам проявить себя. В частности, подчёркивалась важность реализации дополнительных занятий по иностранному языку, так как значимой является не только строка в дипломе выпускника о том, что он является специалистом со знанием иностранного языка, но и реальное владение им на высоком уровне.

Закончился форум торжественным творческим марафоном «Наши таланты – тебе, Беларусь!». Каждый вуз представил свои лучшие коллективы, а Министр вручил участникам сертификаты и дипломы Министерства образования Республики Беларусь.

Важность таких мероприятий, где молодёжь имеет возможность высказаться, обменяться идеями, пообщаться с единомышленниками, задать свои вопросы представителям власти, неоспорима. Хочется верить, что данный праздник станет хорошей традицией, которая позволит студентам всех вузов нашей страны достойно представлять многогранную студенческую жизнь.

**Александр БЕЛЬСКИЙ, студент факультета экономики и права.**

# Призывникам есть над чем задуматься

***Среди молодых людей призывного возраста стало модно уклоняться от службы в армии, не исполнять свой гражданский долг, предусмотренный ст. 57 Конституции Республики Беларусь, которая гласит, что защита Республики Беларусь – обязанность и священный долг гражданина Республики Беларусь.***

***ПРОКУРАТУРА г. МОГИЛЕВА ИНФОРМИРУЕТ***

Некоторые молодые люди сознательно не хотят служить в армии, но хотят пользоваться благами, которые им предоставляет их Родина. Одно из благ – право управления механическим автотранспортным средством.

Прокуратурой города Могилева установлено, что в 2012 году 9 призывников признаны негодными к военной службе и подпадают под перечень заболеваний и противопоказаний, запрещающих допуск лиц к управлению механическими транспортными средствами.

Благодаря проведенной прокуратурой г. Могилева работе за период с 2010 по 2013 год количество призывников, имеющих права управления автотранспортным средством в нарушение ст. 23 Закона «О дорожном движении» уменьшилось.

Проверкой установлено, что признанные негодными к военной службе граждане управляют автотранспортом, а также совершают дорожно-транспортные происшествия. Например, гражданин Петров П.П. в 2012 году признан призывной комиссией негодным к военной службе. В период с 2011 по март 2013 года он 22 раза нарушил правила дорожного движения, в связи с чем 22 раза был привлечен к административной ответственности.

Также установлено, что гражданин Иванов И.И. в 2012 году признан призывной комиссией негодным к военной службе. В период с 2011 по декабрь 2013 года он 4 раза нарушил правила дорожного движения, в связи с чем привлечен 4 раза к административной ответственности. Согласно информации Могилевского областного наркологического диспансера гражданин Иванов И.И. состоит на учете с диагнозом хронический алкоголизм.

Прокуратура города Могилева инициировала переосвидетельствование вышеуказанной категории граждан в соответствии со ст. 23 Закона «О дорожном движении». В настоящее время еще 59 граждан лишились права управления автотранспортными средствами. Работа в данном направлении будет продолжена.

В настоящее время прокуратурой района анализируется информация Могилевского ОГВК за 2012 год в соответствии с перечнем заболеваний, препятствующих исполнению служебных обязанностей на государственной службе.

Уважаемые призывники, Вам есть над чем задуматься. Если решите уклоняться от своего конституционного долга службы в вооруженных силах Республики Беларусь, то можете лишиться водительских прав, права на охоту, права управления маломерными судами, а также работы, связанной с государственной службой.

**Павел ПОЛЯНСКИЙ, старший помощник прокурора г. Могилева, юрист 1 класса.**

# Шлях да навукі

Навуковае супрацоўніцтва паміж асобнымі рэгіёнамі Беларусі заўжды займае важнае месца як у жыцці нашага ўніверсітэта, так і краіны ўвогуле. Акрамя канферэнцый, навуковых праектаў і публікацый, натуральна, існуе і падтрымка самых маладых навукоўцаў.

"Ніколі не думала, што, дзякуючы Магілёўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя А.А. Куляшова, змагу назапасіць такія знойдзеныя мною матэрыялы па тэме "Стараабрадцы Магілёўскай вобласці ў другой палове XX ст.", – распавяла магістрантка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Ірына Мароз. – Асаблівая ўдзячнасць за месяца ў інтэрнаце і дапамогу ў пошуку архіўных матэрыялаў Яўгену Дудкіну – магістранту гістарычнага факультэта МДУ імя А.А. Куляшова. Плённа паўплывала на працу магістранткі з Брэста асабістае сяброўства і прафесійнае супрацоўніцтва беларускіх гісторыкаў прафесараў, дактароў гістарычных навук І.А. Марзалюка і А.А. Габрацкага, якія з разумненм паставіліся да заклапочанасці маладых магістрантаў у навуковых паездках.



Вельмі складана пачынаць навуковы шлях. Асабліва калі даводзіцца здзяйсняць вандроўніцтва. Удзячным адказам Ірыны з'явілася дамамога ў навуковым шляху магістранту МДУ імя А.А. Куляшова. "У студзені 2014г. з тэмай маёй магістарскай дысертацыі "Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай палітыцы 1918 – 1939 гг." давялося быць у Брэсце. Вельмі ўдзячны за дапамогу ў арганізацыі сустрэчы з навукоўцамі Брэсцкага ўніверсітэта, у архіўнай працы і агульным знаёмстве з горадам. Так здзейснілася мая мара: асабістая сустрэча і знаёмства з прафесарам доктарам гістарычных навук А.М. Вабішчэвічам, які даследуе міжваенны перыяд Заходняй Беларусі. Экскурсія па гістарычным цэнтры горада і, канешне, наведванне легендарнай Брэсцкай крэпасці. Яшчэ на чатыры дні мая паездка працягнулася ў Гродна, дзе я таксама працаваў у дзяржаўным архіве, аднак ужо другі раз, бо ўпершыню працаваў падчас напісання дыпломнай працы. Вельмі ўдзячны свайму навуковаму кіраўніку, дацэнту кандыдату гістарычных навук Н.М. Пурышавай за дапамогу і парады ў падрыхтоўцы да паездкі.

Аптымізм, сяброўства, крэатыўныя падыходы і цікавыя навуковыя вандроўкі – вось што аб'ядноўвае нас, маладых даследчыкаў. Наперадзе толькі праца!

**Яўген ДУДКІН, магістрант гістфака.**
**Фота: злева А.М. ВАБІШЧЭВІЧ, справа Я.Я. ДУДКІН.**

# ЭТНИЧЕСКАЯ ТОЛЕРАНТНОСТЬ

***Этническая толерантность (от лат. tolerantia – терпение) – способность человека проявлять терпимость к малознакомому образу жизни представителей других этнических общностей.***

В современной этнопсихологической литературе этническая толерантность понимается как личностное образование, входящее в структуру социальных установок.

Внешне этническая толерантность отражается в выдержке, самообладании, в терпимости к иному образу жизни, инокультурным обычаям, традициям, нравам, чувствам, мнениям и идеям, выражаемым представителями других этносов и культур, способности индивида длительно выносить непривычные воздействия чужой культуры без уменьшения его адаптивных возможностей.

Формирование позитивной этнической идентичности должно включать взаимосвязанную работу по развитию трех компонентов: когнитивного, эмоционального, поведенческого.

Студенческая молодежь представляет собой особую социальную группу, которая в условиях происходящих общественных трансформаций чаще всего оказывается наиболее уязвимой с экономической и социальной точек зрения. Нередко формирующийся у молодых людей комплекс социальных обид принимает форму этнически окрашенного протеста, что создает благоприятные условия для роста на этой почве разного рода «этно» и «мигрантофобий». В «чужих» – «приезжих» и «мигрантах» – молодежь, не имеющая жизненного опыта и знаний, порой начинает видеть причины собственной неустроенности. Они начинают восприниматься как угроза материальному благополучию, как нечто такое, что ограничивает возможности и жизненные шансы молодых людей на рынке труда, образования, жилья и т.д.

Иностранные студенты, обучающиеся в наших вузах, длительное время живут в чужой культуре. Установление непосредственных контактов между представителями разных стран и народов не сразу приводит к открытым и доверительным отношениям. Обычаи страны часто кажутся им непонятными, а люди – странными. Знакомство с непривычным образом жизни, обычаями и традициями не всегда проходит легко. Ощущение потери контроля над ситуацией, собственной некомпетентности и неисполнения ожиданий могут выражаться в приступах гнева, агрессивности и враждебности по отношению к представителям страны пребывания, что отнюдь не способствует гармоничным межличностным отношениям. Мигранты начинают испытывать тоску по родине. Поэтому большое значение приобретает межкультурная адаптация, понимаемая как сложный процесс, благодаря которому человек достигает соответствия (совместимости) с новой культурной средой.

(Продолжение на 4 стр.)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Литературное объединение «Натхненне» недавно отметило 25-летний юбилей. Все эти годы вдохновение не покидает студентов и преподавателей – активных членов объединения. Для многих молодых людей «Натхненне» стало духовным оазисом. Любовь к слову, окрыленность, романтизм, стремление видеть в обычном необычное – все это характерно для «Натхнення», которым руководит Н.А. Михальчук, старший преподаватель кафедры русского языка.**

**В преддверии 8 Марта предлагаем поэтические поздравления любителей поэзии.**

# Источник вдохновения



### Светлана ШУРБЕНКОВА

Лаборант кафедры теории и методики физического воспитания МГУ им. А.А. Кулешова, выпускница физфака нашего университета.

Её стихи печатались в газетах "Могилёвские ведомости"; "Знамя юности"; "Веснік Магілёва"; в поэтических сборниках «На ўзлёце»; "Приднепровские мотивы"; "Давайте говорить стихами" и др.

Награждена дипломами I и II степеней различных литературных конкурсов.

## ЛЮДЗІ НАШАГА ЧАСУ

Чаму такімі злымі людзі сталі?
Ці іх шалёныя сабакі пакусалі?
Ці ад вядзьмарскага люстэрка
шкельцы
Патрапілі ў вочы ім і ў сэрцы?

Ні шкадавання ў іх, ні спачування.
Пайшлі ў нябыт сяброўства і
каханне.
І толькі той разумны і прыгожы,
Хто мае грошы, грошы, грошы,
грошы...

## СЫНЫ

За сталом сям'я сабралася:
Бацька, маці, тры сыны.
Маці дзецям усміхалася:
Хутка выраслі яны.

Ці даўно ў калысцы спалі
Ці рабілі першы крок,
Сшыткі з кніжкамі збіралі
І спяшаліся на ўрок?

Недаспана колькі ночак...
Так не раз, не два было:
Як хвараў які сыночак,
Сэрца, як агнём, пякло.

А сыны, яны, вядома,
Усе гарэзы як адзін.
"Шышак", сінякоў дадому
Шмат прыносіў кожны сын.

Усё было: у кашулях дзіры
І футбол з пабітым шклом,
На штанах смала, хадзілі
Як у лес – усё было.

Ды раптоўна неяк сталі
Ўжо не дзеці, а мужы.
Хутка як павырасталі,
Хутка, што там ні кажы.

І глядзіць з усмешкай маці
На дарослых на сыноў.
Неўзабаве ўнукі ў хаце
Будуць. З імі ўсё ізноў.

### Аляксандр ДВАРАКОЎ

Студэнт факультэта славянскай філалогіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова.

Узнагароджаны дыпломам Міжнароднага беларуска-расійскага літаратурнага конкурсу студэнтаў "Дороже Родины нет ничего".



А я хачу танцуь ў тваіх вачах –
Бяздонным возеры нябеснага
блакіту!
Кранацца рук, схавацца ў валасах,
Пакуль усмешкай гэтай не забіты.

Быць думкамі з табою і лятаць
Туды, дзе неба нам прасціны шые.
І пальцамі далоні казытаць,
І вуснамі схіляць маўклівa шыю.

Патрэбна пастаянна быць з табой.
Расстаннe дзень – тады я ўжо не
ўзнёслы.
Ўдыхаць твой водар, адчуваць
прыбой
Сардэчных хваль тваіх, і ўзмахам
вёслаў

Цябе ўбіраць ў абдымкаў цесны
круг,
Зліваючыся разам і навечна.
Табою жыць, з табою быць і, рук
Не размыкаючы, ісці па шляху
Млечным!

### Вераніка СТАРАСЦЕНКА

Студэнтка 4 курса беларускага аддзялення факультэта славянскай філалогіі МДУ ім. А.А. Куляшова.

Пачала пісаць вершы з 8-га класа. Займаецца жывапісам, танчыць і спявае. Вядзе актыўную працу ў жыцці ўніверсітэта. Заўсёды аптымістка!



## МАЯ ЗЯМЛЯ

Мая зямля, ты зноў чаруеш,
Завеш ласкава, быццам у сне,
І ты красой сваёй хвалюеш,
Даруеш ўсё заўсёды мне.

І я цябе, як тыя словы,
Да нябёсаў шчыра ўзнясу.
І хай шумяць твае дубровы,
Іх песні я ў сабе нясу.

Як сэрца радасна спявае,
Калі ўбачыць родны кут!
Цябе і птушка прывітае,
І зазвініць званочак тут.

Няхай ніколі не заплача
Твой лёс журботнаю слязой,
І кожны вораг хай пабачыць,
Што моцнай ты стаіш сцяной.

### Ірына СЛАШЧЫКАВА

Студэнтка факультэта славянскай філалогіі беларускага аддзялення МДУ імя А.А. Куляшова.

Узнагароджана дыпломам II ступені, намінацыя «Паэзія» Міжнароднага беларуска-расійскага літаратурнага конкурсу студэнтаў «Дороже Родины нет ничего».



## МАЯ ВЁСКА

Мая вёска стаіць на ўзгорку,
Аглядаючы вокам лясы.
Столькі мілага ў нашых прасторах –
Тут балотцы, рачулкі, палі!

Дзе-нідзе захаваны скарбы –
Тут грыбоў, ягад, збожжа кругом!
І чародкаю плаваюць хмары,
Зберагаючы ўсіх спякотным днём.

Ад прываблівага погляду кветак
Закружыцца ў вас галава,
І да долу прыпасці вы мусіце,
Каб спакойнай зрабілась душа.

Я не ведаю, што будзе потым,
Як складзецца далей яе лёс?
Бо народ згоду ў год памірае,
Адыходзіць да царства нябёс.

Я ўсё, што змагу, пастараюся,
Для цябе, мая вёска, зраблю.
Ні за што я цябе не сцураюся,
Будзе вечна любоў у сэрцы жыць!

## Віншуем!

Рэктарат універсітэта віншуе з юбілеем
**ДЗЯМІДАВУ Ніну Мікалаеўну,**
**СЕМЧАНКА Марыю Іванаўну,**
**МАШЧАНКА Раісу Раманаўну,**
**МАРТЫНАВА Пятра Іванавіча,**
**МАРОЗАВУ Алу Аляксандраўну,**
**САПЕГІНУ Наталлю Сяргееўну,**
**ТОМАВА Аляксандра Васільевіча,**
**КАЛАЧОВУ Ірыну Віктараўну,**
**КАЗЛОЎСКУЮ Раісу Рыгораўну!**
*Жадаем добрага здароўя, плёну ў працы і творчасці, асабістага шчасця, дабрабыту і бадзёрага настрою!*

# СТАГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ КАФЕДРЫ

ПАДЗЕЯ

***"Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына..." Ці не ў гэтых знаёмых бадай што з дзяцінства радках купалаўскай класікі мы сёння з развaжлівасцю сталага ўзросту здольныя ўгледзець нейкі больш глыбокі сэнс? Гэтая спадчына – не проста гісторыя, якую можна чытаць і перачытваць у вольны час. Гэта ўнікальная магчымасць памятаць і ўсведамляць свае карані, каб узрошчваць магутнае пладаноснае дрэва. Напэўна, гучыць надзвычай метафарычна ў дачыненні да прадмета размовы. Але ж сімвалічна тое, што гэтыя радкі найлепш увасабляюць асноўную ідэю падзеі, якую без перабольшвання трэба лічыць знакавай у гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова.***



У сценах сучаснага ўніверсітэта актыўна дзейнічае кафедра, якая памятае яшчэ настаўніцкі інстытут, якая стала сведкам стварэння і развіцця педагагічнага інстытута, якой давялося перажыць цяжкія гады рэпрэсій і ваеннага ліхалецця, што прынеслі незамяняльныя страты ў асобах выдатных вучоных і ў патэнцыяле навукова-педагагічных дасягненняў. Гэта найстарэйшая кафедра нашай ВНУ з багатай гісторыяй і сваім непаўторным жыццёвым шляхам – кафедра педагогікі, якая разам з універсітэтам пераступіла векавы рубеж і адзначыла напрыканцы мінулага года стагадовы юбілей.

З гэтай урачыстай нагоды па ініцыятыве загадчыка кафедры Алены Іванаўны Снапковай 17 снежня 2013 года адбыліся педагагічныя чытанні, прысвечаныя стагоддзю кафедры "Сучасная педагагічная навука: праблемы і перспектывы развіцця".

"...Сучасныя навуковыя дасягненні кафедры ёсць даніна гісторыі, традыцыі, якая ўмацавалася на працягу дзесяцігоддзяў, багатай спадчыне навуковых школ па педагогіцы. Галоўнае, каб новае будавалася на падмурку мінулага. Гэта важна – ведаць карані і памятаць, каб ісці па шляху да новых здзяйсненняў," – з такімі словамі звярнулася Алена Іванаўна ва ўступнай прамове да ўдзельнікаў педагагічных чытанняў. І сапраўды, яе словы яскрава адлюстравалі асноўную думку тых актуальных пытанняў і праблем навукі і адукацыі, якія былі вынесены на калектыўнае абмеркаванне.

Добразычлівая атмасфера дружалюбнасці і творчасці, якая панавала ў рабочай аўдыторыі, спрыяла канструктыўнаму ўзаемадзеянню і прадукцыйнай працы, якой кіравалі дэкан факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства І.А. Камарова і А.І. Снапкова.

Удзельнікі педагагічных чытанняў, у ліку якіх былі прарэктар па навуковай рабоце ўніверсітэта А.В. Іваноў, супрацоўнікі і ветэраны кафедры педагогікі, ганаровыя госці-прадстаўнікі ВНУ рэспублікі (БДУ, БДПУ імя М. Танка, ВДУ імя П.М. Машэрава, БарДУ і інш.), калегі з факультэта педагогікі і псіхалогіі дзяцінства, атрымалі магчымасць пагартаць старонкі гісторыі кафедры.

Супрацоўнікамі кафедры падрыхтавана даволі багатая выстава. Яе склалі копіі архіўных дакументаў, шэраг наглядных матэрыялаў, у якіх адлюстраваны розныя аспекты функцыянавання кафедры педагогікі; вынікі даследчыцкай дзейнасці, навуковыя працы і вучэбна-метадычныя дапаможнікі выкладчыкаў; аўтабіяграфічныя і біяграфічныя матэрыялы прафесарска-выкладчыцкага складу розных гадоў, прадстаўленыя ў выданнях перыядычнага друку.

Старшы выкладчык кафедры Э.А. Карпенка разам са студэнтамі фізіка-матэматычнага факультэта падрыхтавала цікавыя відэаматэрыялы "Гісторыя кафедры ў гісторыі ўніверсітэта", дзе можна было ўбачыць архіўныя фатаграфіі і прасачыць, як храналагічна змяняліся асноўныя падзеі ў гісторыі кафедры і ўніверсітэта.

Юбілейная дата адзначана пажаданнямі дабрабыту, росквіту, новых творчых дасягненняў, а таксама памятнымі падарункамі.

**В. СІМЧАНКА, ст. выкладчык кафедры педагогікі.**

# ЭТНИЧЕСКАЯ ТОЛЕРАНТНОСТЬ

*(Продолжение. Начало на 3 стр.)*

Неудачи и проблемы при адаптации в новой культуре необходимо рассматривать не как патологические симптомы, а как отсутствие определенных знаний и навыков. Поэтому должно быть организовано не приспособление человека к новой культуре, а приобретение знаний об обычаях, нормах, ценностях, стереотипах поведения другого народа без разрыва с собственной культурой.

Работа, направленная на формирование этнической толерантности в вузе, обязательно должна строиться на комплексной основе, включая всех субъектов образовательного процесса и все компоненты образовательной среды.

Формирование этнотолерантности может проходить в три этапа: 1) ***мотивационный,*** основная его цель – создание положительного эмоционального фона, ориентированного на общечеловеческие ценности, такие, как терпимость, обычаи, традиции различных народов, вероисповедание, атеизм, права человека; 2) ***познавательный***, на котором предстоит решить следующие задачи: напомнить студентам еще раз об общечеловеческих ценностях; подвергнуть совместному критическому анализу публикации средств массовой информации, отражающие реальные этнические проблемы общества и поиск оптимальных путей их решения с точки зрения общечеловеческих ценностей; развить способности ценить исторический опыт, экономические, культурные, социальные и другие достижения народов, населяющих страну; 3) ***деятельностный***, связанный с необходимостью выработать у студентов качества, необходимые для положительного взаимодействия с представителями различных национальностей. Таким образом, у студентов формируется осознанное отношение к данной проблеме, основанное на уважении к различным этносам и исповедуемым ими религиям, умение общаться с людьми различных национальностей и вероисповеданий. Основу данного подхода составляет понимание того, что формирование нового качества должно осуществляться, во-первых, на основе формирования мотива толерантного поведения и, во-вторых, его навыков. Как уже отмечалось выше, его формирование напрямую зависит от знания истории и культуры своего и других народов.

**Л.Л. ГАБЬЕВА.**

УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЕСНІК
ЗАСНАВАЛЬНІК
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова»

Рэдактар Л.І.ШЫШАКОВА
Карэктура: Т.І. Якубовіч, Т.А.Кажурына
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212000, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
☎ 28-31-51

Падпісана да друку а 17 гадзіне 25.02.2014 г. Тыраж 299 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70). Зак. 1500.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова